■ Спорт-тайм

# ВЯЛІКІ РЭВАНШ АДБЫЎСЯ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем аб выніках матча Кубка Дэвіса, які прайшоў у Мінску, выступленні беларускіх атлетаў на міжнародным турніры ў Германіі і перамозе мінскіх хакеістаў, якая вывела «Дынама» ў плэй-оф Кантынентальнай хакейнай лігі.**

***1. Зборная Беларусі перамагла каманду Румыніі з лікам 3:2 у матчы I групы Еўра-Афрыканскай зоны Кубка Дэвіса.***



Фота БЕЛТА.

Нагадаем, што ў першы дзень турніру каманды абмяняліся перамогамі ў адзіночных гульнях. Спачатку наша першая ракетка Ілья Івашка саступіў Адрыяну Унгуру, а затым Ягор Герасімаў абыграў Марыуса Копіла. У другі гульнявы дзень у парнай сустрэчы наш дуэт Максім Мірны/Яраслаў Шыла ўзяў верх над румынскім Хорыя Тэкаў/Марыус Копіл. Такім чынам, зыход матча павінен быў вырашыцца ў заключны дзень. У стартавай сустрэчы сышліся Ілья Івашка і Марыус Копіл, румыну ўдалося ўзяць верх над гаспадаром корта. А вось у другой сустрэчы пераможнае ачко беларускай дружыне прынёс Ягор Герасімаў, які абыграў Адрыяна Унгура — 7:6, 6:4, 6:4.

*— Зараз няма ніякіх эмоцый. На Ягоры зноў утрымалася тэнісная беларуская зямля. Горда гучыць, і гэта на самай справе так. Малайчына, рэалізаваў у поўнай меры свае байцоўскія якасці. Гэта той чалавек, у якога трэба інвеставаць працу і час. І мы будзем гэта рабіць! Ёсць добры патэнцыял у каманды ў цэлым,* — адзначыў **капітан нашай зборнай Уладзімір ВАЛЧКОЎ.**

У гульні наступнага раўнда Кубка Дэвіса зборная Беларусі 7—9 красавіка сустрэнецца з тэнісістамі Аўстрыі. Нашы хлопцы будуць гаспадарамі матча другога раўнда I Еўра-Афрыканскай групы Кубка Дэвіса. Раней гэтыя зборныя паміж сабой яшчэ не сустракаліся.

***2. Беларускі скакун у вышыню Павел Селівёрстаў атрымаў перамогу на 3-м этапе IAAF World Indoor Tour у Карлсруэ (Германія).*** Наш спартсмен устанавіў асабісты рэкорд, узяўшы вышыню 2.30 м, і пацвердзіў лідарства ў сусветным рэйтынгу сезона-2017.

На гэтым жа турніры Марына Арзамасава на дыстанцыі 800 м стала трэцяй, паказаўшы лепшы час у сезоне. Аліна Талай у забегу на 60 м з бар'ерамі фінішавала шостай з часам 8.23 сек. і ў фінал спаборніцтваў прайсці не змагла.

***3. Мінскае «Дынама» перамагло ў серыі булітаў ханты-мансійскую «Югру» (3:2) і гарантавала сабе месца ў плэй-оф.***

Першы гол «зубры» прапусцілі ўжо на 14-й секундзе і толькі на 35-й хвіліне змаглі зраўняць лік, вызначыўся Роб Клінкхамер. У пачатку трэцяга перыяду Дзмітрый Корабаў вывеў «Дынама» наперад, але Раман Людучын перавёў гульню ў авертайм.

Дадатковыя пяць хвілін пераможцы не выявілі, а ў серыі булітаў дакладныя кідкі Арона Палушая і Аляксандра Мацярухіна прынеслі «Дынама» перамогу.

Гэты поспех дазволіў камандзе гарантаваць сабе месца ў першай васьмёрцы Заходняй канферэнцыі. Адзначым, гэта чацвёрты выхад мінчан у плэй-оф у гісторыі.



***4. Гандбалісты мінскага СКА паспяхова згулялі ў двух выязных паядынках у розыгрышы Балтыйскай лігі.*** У першым матчы ў Клайпедзе мінчане адолелі літоўскі «Драгунас» — 31:28. У другой сустрэчы ў Рызе з латвійскім клубам «Цэлтніекс» армейцы здабылі яшчэ больш простую перамогу — 46:23.

Пасля гэтых вікторый падапечныя Ігара Папругі набралі 12 ачкоў і падняліся на другую пазіцыю ў папярэдняй групе А, наперадзе толькі запарожскі ЗТР. Лідары сустрэнуцца 4 сакавіка ў мінскім палацы спорту «Уручча».

Тым часам БГК імя Мяшкова няўдала выступіў у Славеніі, саступіўшы ў чарговым матчы SEHA-лігі мясцоваму «Цэлье» з лікам 27:29. Пасля 15 матчаў у БГК 26 ачкоў і 5-е месца ў турнірнай табліцы. Лідзіруе македонскі «Вардар».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.45 | 18.03 | 9.18 |
| Віцебск — | 8.39 | 17.49 | 9.10 |
| Магілёў — | 8.35 | 17.53 | 9.18 |
| Гомель — | 8.27 | 17.54 | 9.27 |
| Гродна — | 9.00 | 18.19 | 9.19 |
| Брэст — | 8.55 | 18.24 | 9.29 |

### Месяц

*Поўня 11 лютага.*
*Месяц у сузор'і Рака.*

### Імяніны

**Пр.** *Аляксандра, Анатоля, Віталя, Майсея, Піліпа, Пятра, Рыгора, Уладзіміра, Фелікса.*
**К.** *Рамуальда, Рышарда.*


Фота Надзеі БУЖАН.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

### 7 ЛЮТАГА

**1470** год — дата нараджэння Міколы Гусоўскага, беларускага паэта-гуманіста і асветніка эпохі Адраджэння. Прадстаўнік навалацінскай усходнееўрапейскай літаратурнай школы. Атрымаў адукацыю ў Беларусі, Польшчы, Італіі. У 1518 годзе наведаў Рым у складзе дыпламатычнай місіі ВКЛ. У 1522-м па просьбе Папы Рымскага Льва X напісаў свой лепшы твор «Песня пра выгляд, лютасць зубра і паляванне на яго». У кастрычніку 1523 года выдаў у Кракаве зборнік «Песня пра зубра», які складаўся з празаічнага прысвячэння каралеве Боне Сфорца (прасіў яе ўзяць пад дзяржаўнае заступніцтва таленавітых людзей мастацтва), аднайменнай паэмы і 11 вершаў. Гусоўскі першым у славянскім свеце адлюстраваў сацыяльна-палітычны крызіс у ВКЛ, крытыкаваў палітыку «шляхецкай» Польшчы і «магнацкага» ВКЛ, з абурэннем пісаў пра нападкі простага народа. Адной з галоўных прычын няшчасцяў справядліва называў войны. Бачыў у народнай мудрасці невычэрпную крыніцу для паэзіі. Выступаў за творчае засваенне беларусамі антычнай літаратуры, міфалогіі, лацінскай культуры, важную ролю ў паляпшэнні народнай маралі адводзіў мастацтву і навуцы.




**1897** год — 120 гадоў таму нарадзіўся Аляксандр Леанідавіч Чыжэўскі (1897—1964), рускі філосаф і біяфізік, адзін з заснавальнікаў (разам з К.Э. Цыялкоўскім і У.І. Вярнадскім) рускага касмізму, заснавальнік геліябіялогіі і аэраіонафікацыі. Вынайшаў «люстру», якая насычае паветра адмоўнымі аэраіонамі, карыснымі для здароўя. Аўтар работ «Фізічныя фактары гістарычнага працэсу», «Праблемы іонафікацыі», «Зямное рэха сонечных бур» і іншых.

**1942** год — нарадзілася Тацяна Уладзіміраўна Ходзіна, беларускі вучоны ў галіне анкалогіі, кандыдат медыцынскіх навук. Аўтар навуковых прац па ўжыванні агульнай гіпертэрміі і штучнай гіперглікеміі ў лячэнні злаякасных новаўтварэнняў, фотадынамічнай тэрапіі злаякасных пухлін, распрацоўцы новых эфектыўных схем хіміятэрапіі рака яечнікаў, малочнай залозы, страўніка. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1992** год — 25 гадоў таму міністры замежных спраў, эканомікі і фінансаў краін — членаў ЕЭС падпісалі ў Маастрыхце (Нідэрланды) пагадненні аб пераўтварэнні супольнасцяў у Еўрапейскі саюз (дагавор аб Еўрапейскім саюзе, дагавор аб палітычным і валютна-эканамічным саюзах). Уступілі ў сілу 1 лістапада 1993 года.

### Было сказана

**Уінстан ЧЭРЧЫЛЬ, англійскі дзяржаўны і палітычны дзеяч, прэм'ер-міністр:**

*«Калі табе 20 гадоў, цябе турбуе, што пра цябе думаюць іншыя.*
*У 40 ты перастаеш аб гэтым перажываць.*
*У 60 гадоў ты разумееш, што пра цябе ніхто не думаў, нават калі табе было 20».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Жаночае. Пазнаёміліся на сайце знаёмстваў. Ён піша:**

**«Я спадзяюся, ты не худая?»**

**Ё-маё-ё... Ён ужо мне падабаецца!**

— Фіма, вы дарма гэтую каўбасу купляеце. Яна вядома танная, але есці яе зусім немагчыма, там адна соя.

— Гэта для гасцей.

**Маленькі Вовачка глядзіць, як тата фарбуе столь. Маці кажа:**

**— Глядзі, Вовачка, і вучыся, вырасцеш і тату дапамагаць будзеш.**

**— А што, ён да таго часу сам не дафарбуе?..**

Ты малады, пакуль дзіця не аддало табе свой стары тэлефон.

**— Тата, давай з'ездзім у Грэцыю, піраміды паглядзім, сфінксаў.**

**— Давай лепш з'ездзім у тваю школу — тваёй геаграфічцы ў вочы паглядзім...**


Шаноўную **Таісу Іванаўну НОВІК** — дарагую калляжанку і любімую настаўніцу — сардэчна віншуем з днём нараджэння, з прыгожым юбілеем! Зычым моцнага здароўя на многія гады, бадзёрасці, поспехаў.

Рады, што выпала шчасце разам з вамі працаваць і ў вас вучыцца.

**Былыя настаўнікі Гуцянскай СШ Любоў Кліменцьеўна Вярбіцкая, Аляксандра Аляксандраўна Шахрай, былыя вучні Ірына Кендыш, Вольга Буднік, Аляксандр Жукоўскі, Аляксандр Свірыд ды іншыя.**





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 611.

Нумар падпісаны ў 19.30 6 лютага 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12